Сямейная газета



**Ганна Бахур з сынам вярнуліся дадому**



**Хвароба рэтра-аўтамабілямі**



**Вопыт гатавання «жывога» хлеба**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ВЕРАСНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 168 (28026) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПА ПРЫНЦЫПАХ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА

### будзе і надалей развівацца супрацоўніцтва Беларусі і Кітая

**Візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай прымеркаваны да ўрачыстых мерапрыемстваў у Пекіне з нагоды перамогі ў антыяпонскай вайне і заканчэння Другой сусветнай вайны. На свята ў Паднябесную з'ехаліся лідары многіх дзяржаў, але пра асабліва сяброўскі і канструктыўны ўзровень супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі сведчаць двухбаковыя сустрэчы, якія беларускі Прэзідэнт правёў у гэтыя дні ў Кітаі на самым высокім узроўні.**

Падчас сустрэчы са Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку за кітайскія інвестыцыі і крэдыты, прадастаўленыя для рэалізацыі інфраструктурных праектаў.

За кошт гэтых сродкаў у Беларусі будуюцца дарогі, прапрацоўваецца шэраг праектаў для асваення фінансаў.

Прэзідэнт падкрэсліў, што нядаўні візіт Сі Цзіньпіна ў Беларусь стаў гістарычным і прарыўным. «Сёння супрацоўніцтва вельмі эфектыўна развіваецца», — сказаў беларускі лідар.

Ужо нямала зроблена па будаўніцтве кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». «Вы яго назвалі жамчужынай Шаўковага шляху. Гэта будзе ўнікальны праект», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы і дадаў, што там значна актывізавалася работа.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў таксама кітайскаму боку за ўвагу, што надаецца дзяржавай памяці ахвяр Другой сусветнай вайны, у якой як Савецкі Саюз і Еўропа, так і Кітай панеслі сур'ёзныя страты.



Фота БЕЛТА.

Зыходзячы з прынцыпаў стратэгічнага партнёрства, Кітай гатовы падтрымліваць Беларусь, што адзначыў у сваю чаргу Сі Цзіньпін. «Мы гатовы і далей працаваць з Беларуссю, каб дабівацца яшчэ большых вынікаў у сумеснай дзейнасці», — сказаў Старшыня КНР. Сі Цзіньпін звярнуў увагу на тое, што беларуска-кітайскае партнёрства ўстойліва развіваецца. «Спадзяюся, што бакі будуць актыўна супрацоўнічаць для захавання высокай дынамікі адносін», — адзначыў ён. Гаворачы аб кітайска-беларускім індустрыяльным парку, Сі Цзіньпін падкрэсліў важнасць гэтага праекта. «Мы ўжо многае разам зрабілі па гэтым праекце. Спадзяюся, што сумеснымі намаганнямі мы зможам зрабіць парк узорным прыкладам ініцыятывы эканамічнага пояса вялікага Шаўковага шляху», — падкрэсліў Сі Цзіньпін.

СТАР. 2

■ Учора і сёння

## ЧАС, КАЛІ МЫ МНОГАЕ ЗДОЛЕЛІ

### Фотавыстава БелТА паказала, як мы жылі ў 1990-х і як жывём цяпер

**Рабочая назва фотавыставы Беларускага тэлеграфнага агенцтва, што адкрылася ўчора ў кінатэатры «Масква», «Было — стала», афіцыйная — «Суверэнная Беларусь: эпоха дасягненняў». Выстава расказвае пра тое, якой была наша краіна ў пачатку 1990-х гадоў і якая яна сёння.**

Прадстаўлена 50 работ: палова з іх — чорна-белыя, яны прысвечаны жыццю краіны 25-30 гадоў таму, палова — каляровыя, якія расказваюць пра сучаснае жыццё.

— Гэта ўсяго толькі частка вялікага інтэрнэт-праекта, які размешчаны на нашым сайце, — адзначыў **генеральны дырэктар БелТА Дзмітрый ЖУК.** — Там прыкладна 200 работ. Для чаго мы рабілі гэты праект? Усё вельмі проста. Памяць чалавека працуе такім чынам, што нейкія дэталі сціраюцца. А фатаграфіі дазваляюць успомніць і ўзнавіць агульную карціну. Гэтыя фотаработы вельмі добра дапамагаюць ацаніць рэальны маштаб змяненняў у нашай краіне. Асноўнай аўдыторыяй мы бачым маладых людзей, якія нарадзіліся ўжо ў суверэннай Беларусі.



Фота БЕЛТА.

**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта,** які наведаў адкрыццё выставы, заўважыў, што гэта старт вялікай працы, якую пачынае сёння агенцтва.

Па яго словах, фотавыстава мае каласальнае значэнне для моладзі, якая з прычыны свайго ўзросту не заспела некаторыя падзеі. Архіўныя кадры карэспандэнтаў БелТА здольны нагадаць маладым людзям, як важна захоўваць і прымнажаць тое, што далося краіне велізарнымі намаганнямі і штодзённай працай старэйшага пакалення.

— Фотакарэспандэнты ў сваіх здымках дапамагаюць захоўваць гісторыю, — падкрэсліў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, — а яе ўрокі дазваляюць прымаць рашэнні, што ўплываюць на вызначэнне далейшага шляху нашай дзяржавы. Важна, каб яны былі выверany, і нельга забывацца аб тым, што было раней.

Ігар Бузоўскі паведаміў, што з выставай пазнаёмяцца не толькі наведвальнікі кінатэатра «Масква».

— Яна стане перасоўнай, — паведаміў ён. — Пры падтрымцы БРСМ мы пастараемся, каб моладзь, як мінімум, уключылася ў працэс распаўсюджання інфармацыі пра гэтую выставу па ўсёй краіне.

**Дэпутат Алена ШАМАЛЬ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы,** у сваім выступленні заўважыла, што для моладзі, якая прымае ўдзел у адкрыцці выставы, усё гэта — гісторыя ў карцінках.

— А для многіх грамадзян нашай краіны, у тым ліку мяне, гэта гісторыя жыцця, — сказала яна. — Спадзяюся, выстава дазволіць нам успомніць пра тыя рэчы, якія маюць сапраўдную каштоўнасць для кожнага чалавека. Вельмі прыемна, што сёння тут столькі маладых людзей. Удвая прыемна, што сённяшняя моладзь разумее: палітыка можа аказваць уздзеянне як на паскарэнне развіцця дзяржавы, так і на замаруджванне.

СТАР. 2

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Развіццё супрацоўніцтва ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў практычна ва ўсіх сферах, пачынаючы ад эканомікі і заканчваючы сацыяльнымі праектамі, з'яўляецца найважнейшым прыярытэтам нашай знешняй палітыкі. Рэспубліка Беларусь працягвае паслядоўна выступаць за далейшае аб'яднанне намаганняў усіх дзяржаў — удзельніц СНД у барацьбе са злачыннасцю, улічваючы, што глабалізацыя сучаснага грамадства негатыўна адбіваецца на крымінагеннай сітуацыі. Гэта абумоўлівае неабходнасць далейшага ўдасканалення практычных метадаў нейтралізацыі пагроз, пошук новых шляхоў комплекснага забеспячэння нацыянальнай бяспекі дзяржавы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.09.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17491,00 | ▲ |
| Еўра | 19692,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 262,43 | ▼ |
| Укр. грыўня | 788,77 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X